# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

УДК 069:82(476):069.15(100)

*М. І. Плаўская*

## Роля літаратурна-мемарыяльных музеяў у пашырэнні культурных міжнародных адносін

*На прыкладзе Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы падкрэсліваецца роля музеяў у развіцці айчыннай культурнай палітыкі, іх непасрэдны ўдзел у фарміраванні грамадскай думкі. Разглядаецца, як стасуецца дзейнасць музеяў са знешняй палітыкай і ажыццяўляецца стварэнне станоўчага вобраза краіны за мяжой.*

У сучасным зменлівым і глабалізаваным свеце музей стаў своеасаблівым адукацыйным цэнтрам, адным з важнейшых форм міжнародных гуманітарных сувязей.

Міжнароднае культурнае супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь развіваецца ў рамках незалежнай дзяржавы, якая самастойна здзяйсняе сваю ўнутраную і знешнюю культурную палітыку, распрацоўвае нарматыўна-прававыя асновы міжнароднага культурнага ўзаемадзеяння, заключае пагадненні з замежнымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі, фарміруе механізмы іх арганізацыі.

У 1990-я гг. беларускія навукоўцы пачалі актыўную дзейнасць па вывучэнні замежных сувязей Беларусі, у тым ліку і культурных. Праблематыка культурнага супрацоўніцтва, вялікая роля якога належыць музеям, знайшла сваё адлюстраванне ў дысертацыі Д. Крывашэя[1], прысвечанай напрамкам і формам культурных сувязей з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. У апошнія гады дадзеная праблема прадстаўлена фрагментарна, пераважна ў кантэксце двухбаковага супрацоўніцтва з асобнымі краінамі [5, с. 32]. Больш шырока пытанне разглядаецца ў працах У. Снапкоўскага, В. Лазоркінай.

На сучасным этапе адным з важнейшых аспектаў міжнароднага гуманітарнага ўзаемадзеяння з'яўляюцца музейныя сувязі. Дыялог

[1] Крывашэй Д. А. Развіццё культурных сувязей Беларусі з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы (1991–1996 гг.) : дыс. канд. … гіст. навук : 07.00.02. – Гродна, 1999. – 113 л.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у сферы музейнага супрацоўніцтва садзейнічае фарміраванню, падтрыманню і ўмацаванню пазітыўнага вобраза дзяржавы на міжнароднай арэне. Невыпадкова ён знайшоў адлюстраванне ў знешняй культурнай палітыцы большасці краін, якія аднеслі развіццё музейнага супрацоўніцтва да прыярытэтных кірункаў іх палітыкі [2, с. 112]. У міжнародных культурных сувязях асаблівая роля належыць літаратурна-мемарыяльным музеям, якія ў сучасным грамадстве выступаюць як сродак міжкультурнай камунікацыі і своеасаблівы інструмент правядзення культурнай палітыкі дзяржавы.

*Мэтай артыкула* з'яўляецца вызначэнне ролі літаратурна-мемарыяльных музеяў у фарміраванні міжнародных культурных зносін (на прыкладзе Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы).

Сучасны музей актыўна ўдзельнічае ў фарміраванні грамадскай думкі. Гэта асабліва важна ва ўмовах глабалізацыі [6, с. 254–255]. Міжнародныя выстаўкі станоўча ўплываюць на міжнародныя адносіны. Дэманстрацыя экспанатаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы адбываецца ў розных краінах. У арганізацыі выставак удзельнічаюць пасольствы Рэспублікі Беларусь у гэтых краінах, менавіта дзякуючы ім у Літве, Латвіі, Францыі, Расіі, Украіне і іншых краінах экспазіцыі прадстаўлены на высокім узроўні.

Як меркаваў М. Маклюэн, хуткае развіццё інфармацыйных тэхналогій і новых сродкаў камунікацыі прывялі да фундаментальных змен сучаснага свету, які становіцца ўсё больш глабальным і віртуальным [9, p. 291].

Нягледзячы на рост узаемасувязі розных культурных грамадстваў у агульнай камунікацыйнай прасторы Інтэрнэту, праблемы дасягнення міжкультурнага ўзаемаразумення, талерантнасці і павагі яшчэ захоўваюць сваю актуальнасць. Як адзначае М. Кастэльс, тое, што мы назіраем сёння ў якасці агульнай тэндэнцыі, гэта не столькі рост гамагеннай глабальнай культуры, колькі гістарычная разнастайнасць культур: не канвергенцыя, а фрагментацыя [7, p. 38]. У глабальным кантэксце праблемы міжкультурных зносін становяцца ўсё больш значнымі і выносяць на павестку дня пытанне пошукаў такіх эфектыўных сродкаў камунікацыі, якія маглі б спрыяць пераадоленню «сістэматычнага непаразумення, якое знаходзіцца ля вытокаў дэструктыўнага гвалту ў адносінах да іншых» (пераклад наш. – *М. П.*) [Там жа, p. 39]. Міжкультурная камунікацыя мяркуе стратэгічнае выкарыстанне камунікацыйных тэхналогій у міжнародных зносінах, вынікам якіх з'яўляецца азнаямленне з культурнай прасторай іншых краін. Лічыцца, што такое разуменне культурнага кантэксту патэнцыяльна прыводзіць да развіцця ўстойлівых міжнародных адносін, пабудаваных на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прынцыпе ўзаемнага даверу і паразумення. Культурная дыпламатыя засноўваецца на арганізацыі разнастайных культурных мерапрыемстваў паміж дзяржавамі, якія выкарыстоўваюць культуру ў якасці інструмента для дасягнення эканамічных і палітычных інтарэсаў на міжнароднай арэне [8, p. 11]. Культурная дыпламатыя ў першую чаргу арыентавана на адукацыйныя аспекты ў міжкультурным кантэксце, якія рэалізуюцца праз чалавечыя зносіны паміж удзельнікамі праграм, што з'яўляюцца «жывымі» носьбітамі і перадатчыкамі культурнай інфармацыі [3, с. 171].

Асаблівае значэнне ў працэсе міжкультурнай камунікацыі належыць Дзяржаўнаму літаратурнаму музею Янкі Купалы. Дадзеная ўстанова мае глыбокія даўнія сувязі, неабходныя для захавання, удасканалення, паглыблення адносін паміж народамі і дзяржавамі. Музей мае даўнія сяброўскія адносіны з іншымі музеямі і арганізацыямі, ладзіць разнастайныя сумесныя праекты, выстаўкі. Менавіта з гэтай мэтай былі падпісаны дамовы і мемарандумы аб супрацоўніцтве з замежнымі музеямі: Аб'яднаннем мемарыяльных музеяў Латвіі, Віленскім беларускім музеем імя Івана Луцкевіча (Літва), грамадскім аб'яднаннем «Беларусы Расіі», Музеем У. Маякоўскага ў г. Багдаці (Грузія), Літоўскім архівам літаратуры і мастацтваў і інш. Вялікі навуковы патэнцыял музея праяўляецца і ў тым, што ён з'яўляецца арганізатарам і ўдзельнікам буйных міжнародных канферэнцый (Купалаўскія чытанні, форум славянскіх культур), праводзіць разнапланавую навукова-даследчую дзейнасць у галіне літаратуразнаўства, купалазнаўства, музеязнаўства, становіцца важнай яднаючай прасторай для людзей розных прафесій, нацыянальнасцей і моў.

Для прыкладу адзначым выставачны праект «Два Яны», падчас якога адбываліся двухбаковыя выстаўкі мемарыяльных рэчаў двух геніяльных паэтаў – беларускага Янкі Купалы і латышскага Яна Райніса. Культурныя ўзаемасувязі такога характару ўмацоўваюць і развіваюць міжмузейнае супрацоўніцтва Беларусі і Латвіі, папулярызуюць гісторыка-культурную спадчыну літаратараў за мяжой. Адметнасць праекта ў тым, што выстаўкі (першая адбылася ў Мінску ў 2017 г.), непасрэдна ўключаныя ў экспазіцыю, стваралі ўражанне, нібыта паэты прыехалі адзін да аднаго ў госці.

Павага да нацыянальных традыцый, адкрытасць свету, забеспячэнне доступу да калекцый пры захаванні неабходных мер бяспекі калекцый, гатоўнасць да супрацоўніцтва – прынцыпы, на якіх заснаваны ўнікальны ў сваім родзе міжнародны напрамак дзейнасці музея. Важная асаблівасць музея ў тым, што ён з'яўляецца не толькі сучасным, але і наватарскім. Усе праекты накіраваны на развіццё сувязей

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паміж Рэспублікай Беларусь і іншымі краінамі. У 2018 г. Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы быў удзельнікам Міжнароднага выставачнага праекта «Шляхамі мовы і літаратуры», падчас якога ў розных гарадах Беларусі, Расіі, Літвы, Польшчы, Латвіі праходзілі выстаўкі, на якіх была прадстаўлена спадчына нацыянальных паэтаў у кантэксце еўрапейскага літаратурнага працэсу.

Адным з важных напрамкаў функцыянавання музея з'яўляецца выдавецкая дзейнасць. Выстаўкі становяцца больш даступнымі дзякуючы выданням каталогаў калекцый, зборнікаў навуковых артыкулаў па выніках канферэнцый, іншых кніг, у тым ліку перакладзеных на замежныя мовы: каталог калекцыі фатаграфій Янкі Купалы «Ты гэтых вачэй не забудзь…» (2013), каталог фатаграфій У. Ф. Луцэвіч «На добры ўспамін» (2016), каталог рукапісаў «Аўтографы першага народнага паэта Беларусі Янкі Купалы» (2012), «Рукапісная спадчына Янкі Купалы» (2008), каталог мастацкай калекцыі музея «Я адплаціў народу, чым моц мая магла…» (2019).

Актыўная дзейнасць Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы за мяжой прыцягвае ўвагу жыхароў іншых краін да Беларусі і спрыяе фарміраванню яе станоўчага вобраза за межамі краіны.

Музейная выстаўка – прыклад дэманстрацыі палітычных сімвалаў, знакаў, у тым ліку і ў міжнароднай сферы. Яны спрыяюць супастаўленню гісторыі краін, прымушаюць задумацца над старонкамі мінулага народаў. Адна з выставак праекта музея «У дыялогу культур. Янка Купала і Сербія» (2018) дапамагла раскрыць блізкасць двух народаў, знайсці агульныя рысы ў іх развіцці, яшчэ раз пацвердзіць значнасць літаратуры і асобных літаратараў у фарміраванні міжнародных сувязей.

Папулярызацыя беларускай культуры – адна са сфер дзейнасці музеяў, у тым ліку Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы, па стварэнні станоўчага вобраза Рэспублікі Беларусь за мяжой. У гэтым кірунку праводзіцца актыўная работа ў рамках супрацоўніцтва з іншымі дзяржаўнымі і грамадскімі структурамі (пасольства Рэспублікі Беларусь у Францыі, асацыяцыя «Беларусы Расіі», Дні культуры Беларусі ў іншых краінах і інш.).

Варта адзначыць, што ў наш час дзве з'явы змяняюць сацыяльную значнасць музеяў. Першая з іх – масавы турызм, які знаёміць мільёны людзей з гісторыяй і мастацтвам сусветных цывілізацый. Сёння музей – адзін з пунктаў у плане замежнага госця краіны. Другі фактар звязаны са спецыфікай сучасных масмедыя. Міжнародная выстаўка – абавязковы аб'ект увагі тэлевізійных праграм, газет і часопісаў. Прычым традыцыйна музейны вернісаж інтэрпрэтуецца ў сродках масавай інфармацыі як «добрая навіна», такая рэдкая ў агульным патоку паведамленняў пра

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эканамічны крызіс, тэрарызм і інш. Афішы, якія паведамляюць пра міжнародныя выстаўкі, размяшчаюцца ў гістарычных цэнтрах гарадоў усяго свету. Так фарміруецца станоўчы вобраз музея як феномена культуры. Інфармацыйнае ўздзеянне музея фактычна распаўсюджваецца на вельмі шырокую аўдыторыю, і не толькі яго наведвальнікаў. Сённяшні музей з'яўляецца важным інстытутам сучаснага грамадства.

Міжнародная музейная сістэма імкнецца да «культурнай інтэрвенцыі» ў самыя шырокія слаі сучаснага грамадства.

Цалкам самастойнай з'явай з'яўляецца ўзаемадзеянне дыпламатыі і музейнай культуры, якое мае даўнія гістарычныя традыцыі. Даволі часта шэдэўры мастацтва, літаратуры, навукі, сімвалы мінуўшчыны непасрэдна ўцягнуты ў дыпламатычныя адносіны і становяцца музейнымі помнікамі – помнікамі гісторыі знешняй палітыкі. Нельга не адзначыць, што ў некаторых выпадках на музейных калекцыях адлюстроўваюцца знешнепалітычныя ініцыятывы, амбіцыі лідараў. Правядзенне музейных выставак і наведванне музеяў суправаджае візіты на вышэйшым узроўні кіруючых асоб. Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы амаль з самага пачатку свайго існавання атрымлівае падарункі ад розных замежных дэлегацый, якія наведваюць краіну. Гэтая традыцыя захавалася і сёння. Так, бібліятэка імя Францыска Скарыны ў Лондане перадала якасныя лічбавыя копіі рукапісаў твораў Янкі Купалы, якія там захоўваюцца, грамадскае аб'яднанне «Беларусы Расіі» падарыла музею калекцыю партрэтаў мастака І. Паўлава, сярод якіх і невядомы дагэтуль партрэт Янкі Купалы.

Можна ўпэўнена сказаць, што гісторыя музейнай справы непарыўна звязана з дыпламатыяй. Культурная дыпламатыя вызначаецца як «абмен ідэямі, інфармацыяй, мастацтвам і іншымі аспектамі культуры, якія здзяйсняецца паміж нацыямі і іх народамі з мэтай умацавання ўзаемаразумення» [3, с. 171].

Дзейнасць музеяў часта аказваецца ў цэнтры актыўнай дыпламатыі. Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы паспяхова супрацоўнічае з Жаночым клубам, у якім для жонак паслоў і дыпламатаў ладзяцца разнастайныя мерапрыемствы, дарэчы, па іх ініцыятыве праведзены такія акцыі, як «Чытаем Купалу разам», «Калядкі ў Купалавым доме», вясельны абрад, вячоркі ў Вязынцы і інш. Удзельніцы клуба сталі пастаяннымі гасцямі музея, а таксама яго мерапрыемстваў і выставак, якія ажыццяўляюцца за мяжой.

«Музей стварае рэчаіснасць з яе ўласных элементаў», – сцвярджаюць спецыялісты. Гэта тычыцца не толькі асаблівай формы эматыўнага пазнання. Музеі як важныя інстытуты інфармацыйнага грамадства з'яўляюцца паўнавартаснымі аб'ектамі культурных міжнародных зносін. Выстаўкі і публікацыі пра іх у сродках масавай інфармацыі ствараюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дастойны вобраз краіны за мяжой. На ўзаемаразуменне паміж народамі ўплываюць інтэрнацыянальныя асветніцкія, адукацыйныя, навуковыя праекты [4, с. 60].

Міжнародная дзейнасць музеяў – адна з форм прафесійнага, навуковага і мастацкага супрацоўніцтва ў сучасным свеце. Як любое прафесійнае міжнароднае грамадства супрацоўнікі музеяў праводзяць адпаведную работу, каб усталяваць трывалыя «масты ўзаемаразумення» паміж рознымі краінамі.

Выстаўкі і іншыя міжнародныя праекты прадугледжваюць сабой акты грамадзянскай народнай дыпламатыі. Акцыі музеяў часта непасрэдна ўзаемазвязаны з міждзяржаўнымі дыпламатычнымі кантактамі. Ужо традыцыйнай стала акцыя Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы «Чытаем Купалу разам», якая праводзіцца ў Міністэрстве замежных спраў штогод у Дзень роднай мовы. Візіты на вышэйшым узроўні суправаджаюцца маштабнымі музейнымі праектамі. Значныя двухбаковыя выстаўкі сімвалізуюць сяброўскія адносіны паміж краінамі.

Культурныя сувязі – адзін з самых гуманістычных і таму найбольш эфектыўных інструментаў у механізме знешнепалітычнай дзейнасці. Яны спрыяюць стварэнню ўмоў для мірнага дыялогу і супрацоўніцтва дзяржаў, народаў, якія адносяцца да розных культурных традыцый [1]. Навука, літаратура, мастацтва, культурныя традыцыі – здабытак усяго чалавецтва, яны вышэй за межы і нацыянальныя бар'еры. Музеі як сродак пашырэння інфармацыйнага і культурнага гарызонту іграюць у грамадстве выключную ролю – аб'ядноўваюць людзей падчас правядзення разнастайных сустрэч, мерапрыемстваў, рэалізоўваюць адукацыйныя, асветныя і міжнародныя праекты, у тым ліку дабрачынныя, з'яўляюцца інструментам культурнай палітыкі краіны і інш.


1. *Александров, А. А.* Музеи в контексте современных международных отношений / А. А. Александров // Человек и общество перед судом истории : сб. ст. / отв. ред. Н. И. Басовская. – М., 2012. – С. 60.

2. *Боголюбова, Н. М.* Межкультурная коммуникация и международный культурный обмен : учеб. пособие / Н. М. Боголюбова, Ю. В. Николаева. – СПб. : СПбКО, 2009. – 415 с.

3. *Гринчева, Н.* Культурная дипломатия 2.0.: перспективы использования в международной музейной практике / Наталья Гринчева // Вопросы музеологии. – 2013. – № 1. – С. 171–185.

4. *Грицкевич, В. П.* История музейного дела до конца XVIII века : в 2 ч. / В. П. Грицкевич. – СПб. : С.-Петерб. гос. ун-т культуры и искусств, 2001. – Ч. 2. – 408 с.

5. *Снапковский, В. Е.* Международное культурное сотрудничество Республики Беларусь (1991–2011 гг.) / В. Е. Снапковский, О. И. Лазоркина // Журнал международного права и международных отношений. – 2011. – № 4. – С. 32–40.

6. Современные глобальные проблемы / отв. ред.: В. Г. Барановский, А. Д. Богатуров. – М. : Аспект Пресс, 2010. – 350 с.

7. *Castells, M.* The Network Society: a Cross Cultural Perspective / ed. by Manuel Castells. – Northampton, MA : Elgar, 2004. – 464 p.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. *Gienow-Hecht, J. C. E.* What Are We Searching For? // Searching for a Cultural Diplomacy / ed. by J. C. E. Gienow-Hecht, M. C. Donfried. – New York : Oxford, 2010. – 265 p.
9. *McLuhan, M.* The Gutenberg Galaxy: The Making of Typographic Man / M. McLuhan. – Toronto : Univ. of Toronto Press, 1962. – 293 p.

*M. Plauskaua*

**The role of literary and memorial museums in the empowerment of international cultural relations**

*On the example of State Literary Museum of Yanka Kupala the role of museums in the development of national culture policy, and their direct participation in the formation of social thought are emphasized. It is considered how the activity of museums correlates with the foreign policy and how a positive image of the country abroad is created.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 18.10.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ